# Слуцкія піонерважатыя на прыёме ў таварыша Валковіча

Учора палац піонераў наведвалі старшыя піонерважатыя Слуцкай акругі.

Перад наведваннем палаца ўсіх 115 піонерважатых прыняў сакратар ЦК КП(б)Б таварыш Валковіч. На прыёме прысутнічалі сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Манаеў і загадчык аддзелам піонераў тав. Рутэнберг. Больш двух гадзін прадаўжалася таварыская гутарка.

Піонерважатыя Глебва (Траск), Пільнік (Слуцк), Гельфанд (Старобін), Рагапінская (пукаўская школа), Рагач (Мазрана), Карповіч Люба (Семежава) расказалі пра работу піонерскіх арганізацый сваіх школ, расказалі аб тым, якія падарункі рыхтуюць піонеры да VIII надзвычайнага з'езда Советаў Саюза.

Важатая тав. Рагапінская прачытала адрывак верша, які напісалі піонеры пукаўскай школы і прысвяцілі яго новай Канстытуцыі і яе творцу — другу дзяцей вялікаму Сталіну.

Піонерважатая Карповіч паднесла таварышу Валковічу падарунак ад сваіх піонераў Харытановіча і Курпана — намалёваныя імі партрэты таварыша Сталіна і Александра Сергеевіча Пушкіна.

У канцы таварыскай гутаркі выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Валковіч. Перадаўшы ад імя ЦК КП(б)Б і асабіста ад тав. Гікало піонерам Слуцкай акругі вялікае бальшавіцкае ад усяго сэрца прывітанне, тав. Валковіч зрабіў некалькі заўваг аб рабоце піонерважатых.

Яшчэ ў часе гутаркі тав. Валковіч запытваў у піонерважатых. ці многа ў школах гурткоў самадзейнасці, як яны працуюць. Піонерважатыя назвалі надзвычай многа гурткоў. У сваёй прамове сакратар ЦК КП(б)Б звярнуў увагу піонерважатых на недапушчальнасць фармалізму ў рабоце школьных гурткоў.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы